**Валерый Маслюк**

*Юнацтву майму прысвячаецца*

# ФЛАМЕНКА

**Танец кахання для тых, каму…**

**на дзве часткі**

**<u>ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ</u>**

**НАШЫ:**

**ЁН**

**ЯНА**

**МАЦІ**

**ЮРА**

**КАПА**

**ФЕДЗЯ**

**ВАСЯ**

**НЕ НАШЫ:**

**РАБАЎНІК**

***ДЗЕЯ ПЕРШАЯ.***

*Дзея адбываецца ў нашы дні ў звычайнай аднапакаёвай кватэры. У падобных да яе мы часта бывалі, а можа быць, нехта з нас да гэтага часу жыве… Сценка, тэлевізар, стол, кнігі, вядома, партрэт на сцяне, любы, ад Хамінгуэя да Кафкі.*

*Дзверы ў кухню – налева, у сумесны санвузел – направа. Адзін пакой даволі вялікі. Шкляныя дзверы яго даюць магчымасць добра бачыць, што адбываецца ў вітальні. Добра чуваць, як паварочваецца ключ у дзвярах.. Стоп! Ледзь не забыўся! Незвычайнымі ў звычайнай кватэры з'яўляюцца дзве рэчы: гэта сапсаваная рэклама нечага расцвечвае кватэру нейкім дзіўным святлом па сваіх сапсаваных законах, і крэсла-качалка перад тэлевізарам... У ім – нікога, як у кватэры, а яно, уявіце сабе ўсё калышацца і калышацца... Дарэчы, тэлевізар таксама працуе. Толькі экран пусты – ужо даволі позна.*

*І толькі цяпер: «Добра чуваць, як паварочваецца ключ у дзвярах...» Тэлевізійны экран гасне. Качалка спыняецца, у кватэру заходзяць ЁН і ЯНА.*

ЯНА *(уключыўшы святло ў вітальні)*. Вось тут я і жыву.

ЁН. Міла.

ЯНА. І толькі?

ЁН. Пачакай, дай агледзецца!

ЯНА. Ды не здымай ты чаравікі! Ненавіджу мужыкоў у шкарпэціках пра гальштуку.

ЁН. А ў чаравічачках навідзіш?

ЯНА. Навіджу. Вып'ем?

ЁН. А давай!

ЯНА. Ёсць “Тамянка”. Ты ж любіў...

ЁН. А адкуль ты...

ЯНА. Пінжак можаш зняць... Калі хочаш...

ЁН. А да мужыкоў без пінжакоў, як ты?

ЯНА. Сёння – цярпіма. Есці хочаш?

ЁН. Ты што? Колькі можна!

ЯНА. Не люблю я рэстаранную ежу, таму што заўжды пра цэны думаеш.

ЁН. Ой, і сёння, пры мне?

ЯНА. І сёння, пры табе. Звычка. Слухай, ёсць сала фірмовае, мама сама робіць: бярэ свежае ў слоік, варожыць, тры дні ў халадзільніку – і гатова.

ЁН. А агурок салёненькі ёсць?

ЯНА. Крыўдзіш, начальнік. А ты начальнік які? Вялікі, маленькі, сярэдні?

ЁН. Вялікамаласярэдні.

ЯНА. Не сумуй, я зараз.

*Яна выходзіць у кухню. Ён, як і кожны б з нас на новым месцы, пачаў аглядацца: выцягнуў кніжку з паліцы, паставіў на месца, перабраў некалькі пласцінак са стосу ля прайгравальніка.*

*ЯНА, увайшоўшы з падносам з ежай, моўчкі назірае.*

ЁН *(заўважыўшы яе).* Як і раней, музыка, музыка, музыка!

ЯНА. Як і раней, але тут толькі класіка. Да стала!

ЁН. Пастаў што-небудзь.

ЯНА. Бутэльку адчыні. Мужык ёсць у хаце!

ЁН А штопар?

ЯНА *(падаючы штопар)*. Ёсць.

ЁН *(адкаркоўваючы бутэльку).* А дзе музыка?

ЯНА. Разумееш, я ж кажу: толькі класіка.

ЁН. І выдатна. А давай я сам выберу.

ЯНА. Давай.

ЁН *(заплюшчыўшы вочы, пальцам вядзе па стосу з пласцінкамі).* Гэта старажытныя цыганскія цудадзейны словы: Адноры, дворы, трычы, лычы, пады, лады, кукі, лдычы. Дэвэр, дэс! А можа, індыйскія! Вось яна *(Ставіць пласцінку, уключае прайгравальнік, гучыць "Фламенка".)* Гэта ж "Фламенка" – танец кахання.

ЯНА. Так, але ведаеш – давай без музыкі!

ЁН. Чаму? Якасць не падабаецца? Пласцінка трошкі заезджаная, ну і што?

ЯНА. Падабаецца, але ж мы і ў рэстаране Сцінга перакрыквалі. Давай цішыню паслухаем.

ЁН *(спыніўшы музыку).* Добра, што хоць Сцінга. *(Падсеўшы да стала.)* Пачынаем!

ЯНА. То?

ЁН. Слухаць цішыню.

ЯНА. Напачатку тост.

ЁН. Давай.

ЯНА. Ты – тост. Ты заўсёды гаварыў прыгожа.

ЁН. Ты пра выпускны? Да гэтага не ведаю, як мяне хапіла на тосты да раніцы? Найшло нешта? Нікому слова не даваў уставіць, гаварыў і гаварыў.

ЯНА. І не толькі на выпускным.

ЁН. Так дзіўна! Адзін раз у жыцці вырваўся у дом адпачынку, каб за абедам на трэцяе – абавязкова кампот... І цябе я не бачыў: за ўсімі назіраў, цікава, ды і прафесійнае, а цябе не было, а ты ўжо была... І сёння – ідзеш насустрач...

ЯНА. Пасля гразевых ванн.

ЁН. Але чаму ў апошні дзень? Мне ж заўтра ад'язджаць.

ЯНА. У цябе апошні, у мяне – першы. З сённяшняга дня ў мяне курсоўка.

ЁН, А ты мяне адразу пазнала?

ЯНА. Не пазнаеш цябе!

ЁН. Хопіць, колькі гадоў прайшло.

ЯНА. Толькі давай не будзем падлічваць, стане сумна.

ЁН. А ты зусім не змянілася.

ЯНА. Камплімёнтаў не трэба, усё роўна не паверу.

ЁН. Добра, што мы збеглі.

ЯНА. Так, хоць я і не хадок па рэстаранах. *(Памаўчалі.)*

ЁН. За цішыню!

ЯНА. За самую-самую ціхую!

ЁН. Сапраўды "Тамянка". Адкуль ты ве...

ЯНА *(перабіваючы).* Новы год сустракалі, з мужам, у рэстаране, а там халадзільнік здох. Муж ля ўваходу шампанскае ў гурбіну закапаў, пахаладзіць.

ЁН. Знайшлі?

ЯНА. Пакуль шукалі, Новы год і прыйшоў.

ЁН. А ён зараз дзе?

ЯНА. З сынам на мора ірванулі. Традыцыя ў нас: у адпачынку адпачываць адзін ад аднаго, вось яны – на мора, а я на мора не хачу: якое мора, зіма вось-вось. Летам, пакуль да мора прызвычаешся, ад'язджаць пара, а ў нас і лепш, і таксама морам завецца, а там – спёка... *(Памаўчалі.)*

ЁН *(аб кватэры).* Як жа вы тут утрох, прабач?

ЯНА. Мама яшчэ. Так што нас – чацвёра. На большую не хапае, ды і потым – мы што адны вось так, людзі гадамі ў падвалах жывуць.

ЁН. Колькі яму?

ЯНА. Каму?

ЁН. Сыну.

ЯНА (*паказвае рукой*). Вось столькі...

*Чутна, як паварочваецца ключ у дзвярах.*

ЁН. Нехта заходзіць. Чуеш?

ЯНА. Я – зараз.

*Яна выходзіць у вітальню, а там ужо мама распранаецца, тапачкі надзявае.*

МАМА *(уваходзячы ў пакой, Яму).* Наша вам, вось з такім вось памазком.

ЯНА. Мама!

МАМА. Я не перашкодзіла. Гэта ён нам з табой перашкодзіў!

ЁН. Прабачце...

МАМА. А ты сядзі, сядзі! Па дыванах маіх у чаравіках хадзі, сала маё еш, там яшчэ галубцы засталіся. Што ж ты не прынесла? Госць дарагі ў хаце.

ЯНА. Я зараз прынясу. *(Выходзіць на кухню.)*

МАМА. Ну, пазнаў мяне, госць дарагі?

ЁН. Так.

МАМА. І то. Дзякуй Богу!

ЯНА *(увайшоўшы).* Я паставіла галубцы грэцца.

МАМ. А потым будзем гарбату піць з ліпавым мёдам.

ЁН. Даруйце...

МАМА. Бог даруе, я – ніколі. Дачушка, а дзе для мяне чарачка?

ЯНА *(падае чарку).* Калі ласка.

МАМА. Не не гэтую, крыштальную, свята ж у нас. *(Ён бярэцца за бутэльку. Мама адбірае віно.)* Сама налью.

ЁН. Я не разумею.

МАМА. Зараз зразумееш. Дачушка, ты б выйшла.

ЯНА. Я пасяджу тут.

МАМА. І то праўда, таямніц у нас няма. Тост. Вы не супраць?

ЁН. Не.

МАМА. Я вас, госць шаноўны, ненавіджу, і выпіць хачу за тое, каб вы зніклі і не толькі з гэтай кватэры, а наогул, назаўжды, каб нават ў страшных снах ні ёй, ні мне больш не сніліся. Вып'ем?

ЁН. Навошта. Час знікаць.

ЯНА. Застанься.

МАМА *(да Яе).* У цябе гонар ёсць? Чаму ты дзяцей вучыш? У цябе годнасць жаночая ёсць?

ЯНА (*да Яго*) .Застанься.

МАМА. Госпадзі, за што?

ЁН. Вы прабачце, але ж я застаюся.

МАМА. Я – таксама.

ЯНА *(да Мамы).* Толькі без слёз! Дамовіліся?

МАМА. Якія слёзы? Глянь, скончыліся слёзы, няма іх, сэрцам выйшлі.

ЯНА. Мама!

МАМА. Я вып'ю. За свой тост.

*Пранізлівы званок у дзверы. Яна выходзіць у вітальню.*

МАМА *(Да Яго).* Колькі часу?

ЁН. Без чвэрці дванаццаць.

ЮРА *(уваходзячы, ліхаманкава).* Суседзі, бяда!Маё прабачэнне.

МАМА. Юра, колькі можна?

ЮРА. Маё прабачэнне! У вас госць. Разумееш, маць?

МАМА. Я табе не маць. Мамку знайшоў!

ЮРА. Маё прабачэнне. Грошы ад казы схаваў, у майстэрні, у падвале. Прачнуўся, дабавіць трэба, а схаваў – не помню дзе, бяда!

ЯНА *(падаючы чарку).* Вось, выпіце!

ЮРА. Вашага не магу, вы самі не п'яцё, з вамі нельга, да і арганізм мой вашага дабра не прыме, яму прасцейшае трэба. А ў вас, я ж бачу.

ЁН. У чым праблема?

ЮРА. Каб выпіць, трэба ўспомніць, дзе заначку схаваў, а каб успомніць, трэба выпіць, а каб выпіць, трэба знайсці.

ЁН *(дастаючы грошы).* Столькі хопіць?

МАМА. Багаты госць!

ЮРА *(да Яго).* Сам п'еш?

ЁН. Бывае.

ЮРА. У цябе – можна, але вярну. Цябе не будзе – суседкам вярну.

МАМА. Будзе поўсці шматок.

ЮРА. Душэўная жанчына, я табе кажу...

ЁН *(перабіваючы).* Дамовіліся.

ЮРА *(да Яго).* Руку! Суседзі, маё прабачэнне!

*Юра выходзіць у кухню.*

ЯНА. Юра, вам сюды!

ЮРА. Маё прабачэнне.

*Юра выходзіць з кватэры. Усе доўга маўчаць.*

ЁН. Святло за акном дзіўнае.

ЯНА. Рэклама за акном, нешта сапсавалася.

МАМА. Мы прывыклі.

ЁН *(да мамы).* За што вы мяне так?

МАМА *(прынюхваючыся).* Адкуль дым? Мы што, гарым?

ЯНА. Бедныя галубцы!

МАМА *(да Яе).* Што сядзіш? Вадой залі. Заўтра адмыем. *(Яна выходзіць. Услед Ёй.)* Нічога даверыць нельга.

Ён *(да Мамы).* Дык за што ж вы мяне так?

МАМА *(да Яго).* А як з табой інакш? Ты ж нам усё жыццё спляжыў! Як жа так атрымалася? Яна ў цябе з пятага класа! І што гэта за каханне такое? Я толькі ў дзевятым даведалася. Маркаўна сказала. Ну, думаю, узрост, пройдзе, супакоіцца, а яна, Госпадзі, да гэтага часу. І што гэта за каханне такое! Хоць бы ты прыгажун які быў, а так, паглядзі на сябе ў люстэрка. За што?

ЁН. Прабачце... Не разумею.. Мы – сябры.

МАМА. Сябры? А гэта ты бачыў, сябар?

*Мама дастае з шуфляды вялікі пакет, высыпае з яго на стол фотакарткі, выразаныя артыкулы з газет, лісты.*

Вось – глядзі. Ты – на выпускным балі, гэта ты – з дошкі гонару сама садрала, зладзюга. Тут артыкулы пра цябе, злачынства выкрыў, медаль далі, тут прызначылі. Гэтая дурніца цябе праз ноч у ва сне бачыць, а можа, і кожную. Ужо за сорак! Ні дзяцей, ні мужыка ў хаце. Шосты тыдзень кран у ванне цячэ, адрамантаваць няма каму.

ЁН. А на моры хто?

МАМА. На якім моры?

ЁН. Там спёка, муж з сынам. *(Паказвае рукой узрост.)* Яму вось столькі.

МАМА. Які муж! Які сын! Напляла табе, гордая. Адна яна, адна, вакол адна, давёў, капітан.

ЁН. Я не капітан.

МАМА. Няўжо генерал з Мухазадонска? Прыехаў, глянуў, перамог. Гэта мне, маці, у вочы маніць! Сяброўкі прыедуць, да Веры схадзі. Чула маё сэрца! Вось засталася б там – і што? Вы тут усю ноч? І што тады?

ЁН. І што тады?

МАМА. А цябе, кабель, і след прастыў.

ЁН. Навошта вы так, мама?

МАМА. А як мне з табой трэба, скажы, дабрадзей мой ненаглядны? *(Раптам.)* Пінжак апрані.

*Ён апранае пінжак.*

Ты крутануўся – і да жонкі, да дзетак. Ды ведаю, усё ведаю. А нам потым як? На маю пенсію і дапамогу па беспрацоўю?

ЁН. Яна не працуе?

МАМА. Працуе за пяцёх. А толку? Колькі настаўнікам плацяць?

ЁН. Зразумела.

МАМА. Што табе зразумела? Колькі круцілася вакол яе! Не табе роўня! Быццам усё добра, гарбату пілі. *(Раптам.)* Час каторы?

ЁН. Першы.

МАМА. Гавару: дачка, давай, любая! Як гляне, вось, як ты зараз на мяне глядзіш.

ЁН. Як я гляджу?

МАМА. З таго баку, як?

*Уваходзіць Яна.*

ЯНА. Патэльню я вымыла.

МАМА. Я сваё адравела, а ты калі?

ЯНА. Бачна?

МАМА. Не.

ЯНА. Усё растлумачыла?

МАМА. Усё. Ці дайшло толькі?

ЯНА (*да Яго*). Вось так!

МАМА (*да Яго*). Дайшло, генерал?

ЯНА *(да Яго).* Што будзеш рабіць?

ЁН. Не ведаю, але я застаюся.

МАМА. Папярэджваю: я нікуды ніколі больш не іду, ні да якай сяброўкі, я гляджу тэлевізар! *(Мама уключае тэлевізар. Зіхаціць пусты экран. Да Яе.)* Зноў ты маё крэсла адсунула?

ЯНА. Я не дакраналася да твайго крэсла.

МАМА. Усё я ведаю: і пра званкі ў ягоны Засранск, і пра ліст ад аднакласніцы...

ЯНА. Ты яго чытала?

МАМА. Сама ж кінула на стале. Я не дакраналася, але ж вочы, яны самі чытаюць. *(Цытуе.)* «У яго пуцёўка да другога». Я адразу не зразумела. І дырэктар твой звоніць. *(Цытуе.)* «Мы тваёй дачушкі дасталі ўсё ж такі пуцёўку. Не хвалюецеся, у наш час язву у момант вылечваюць». І як школе тваёй цябе не будзе хапаць. Дзякуй Богу, язвы ў цябе ніколі не было.

ЯНА. А ты?

МАМА. Я не язва, я – ануча палавая. Ты аб мяне ўсё жыццё ногі выціраеш. *(Мама засяроджана глядзіць у пусты экран. Не вытрымаўшы.)* А сёння ў Веркі на каляндар гляджу, сёння ж другое. Усё зрабіла, уладзіла. *(Да Яе.)* Ну што, не мая праўда?

ЯНА. Як кіно?

МАМА. Каторая гадзіна?

ЁН. Ужо позна.

МАМА. Мужыкам ніколі не позна, а вось нам...

ЯНА *(да Мамы).* Выключы, калі ласка, тэлевізар.

МАМА. Калі ласка, выключыла, але нікуды не пайду.

ЯНА *(да Яго).* Хочаш гарбаты?

МАМА. Мёд у шуflядцы, там другая палічка зверху.

ЁН *(да Яе).* Дзякуй, я не хачу. Карты ёсць? Я фокус ведаю.

МАМА. Няма карт, фокуснік!

ЯНА. Мама, у нас ёсць карты.

МАМА. Я на іх варажу.

ЯНА. Вось і хопіць варажыць. Няхай пакажа.

МАМА. І праўда, што там варажыць, векавухай была, векавухвй і застанешся. Трымай, фокуснік, давай фокусамі пацеш.

ЁН *(пeратасоўвае карты і так, і гэтак, але...)* Я не помню.

МАМА. Нават фокуса не помніць.

ЁН. Як завяршаецца памятаю, а вось пачатак...

МАМА. Зразумела. Не памятае, бывае...

ЯНА. Давайце ў дурня згуляем.

МАМА. А навошта? Была дурніцай, дурніцай і застанешся.

ЁН. Навошта вы так?

МАМА. А як з вамі трэба?

ЯНА *(да Яго).* Здавай!

*Ён здае карты, яны гуляюць.*

МАМА *(кідаючы карты ў фінале гульні).* Усё роўна не пайду нікуды! І сама здам! Давайце, давайце, гуляем!

*Яны гуляюць кожны за сябе. Мама зноў пераігрывае.*

МАМА. Можа карты не ўсе. Я пералічу! *(Пералічвае. Да Яе.)* Здымі! *(Яна здымае. Паглядзеўшы на апошнюю карту ў калодзе.)* Зноў хрэсці!

*Гуляюць.*

ЯНА *(выкладваючы адны козыры).* Мама, прабач.

ЁН *(выкладваючы адны козыры).* Так атрымалася.

МАМА. Што атрымалася? Што атрымалася? У вас адны козыры!

*Званок у дзверы: кароткі, і потым – яшчэ два кароткіх.*

ЯНА. Капа прыйшла.

МАМА *(крычыць).* Адчынена! Заходзьце.

КАПА *(уваходзячы).* Я не вельмі позна?

ЯНА. Праходзьце, Капа, сядайце.

КАПА. Я на гадзіннік паглядзела. А ў вас – галасы! У карты гуляеце? А мне можна?

МАМА. Сядай, Капа, сядай!

КАПА. Два на два?

МАМА. Не ўжо, кожны сам за сябе! Хоць... Капа, мы з табой гуляем, я здаю, хто шасцёрка, той ходзіць! *(Раздаўшы карты.)* Мы ходзім! *(Да Капы.)* Хадзі!

КАПА. Я? А! Ну, так! Шасцёрка ж мая! *(Ходзіць.)* Валет!

МАМА. Ты гэта што?

КАПА. Меншых няма!

ЯНА. Вы яшчэ адзін аднаму карты пакажыце!

МАМА *(зайшоўшы).* Яшчэ валет!

ЯНА Казырны?

МАМА. Для цябе нічога не шкада! Я хаджу. Сем хрысцей!

*Гуляюць.*

КАПА. Раніцай вокны адчыніла, на падвоканне прылегла: дзявятая гадзіна толькі, мой пайшоў, шабашыць побач. Яшчэ дзесяць! Я толькі ўзяла. Гляджу, на лаўку мужыкі прыселі і з гарла п'юць. У мяне няма. І п'юць моўчкі. А раней, калі мы гулялі, размаўлялі,

песні спявалі. Кароль, яшчэ кароль! Ой, я адбілася! А гэтыя толькі п'юць. Выпілі. Гэта я зараз бяру? Дзякуй! Адзін заснуў, а другі ў яго па кішэнях палазіў і сышоў. Дзве дамы!

ЯНА. Я бяру.

МАМА. І пагоны вам зверху! Здавай, фокуснік!

ЁН. Я неяк стаміўся!

МАМА. Дзве гульні яшчэ сыграеш – і адпачывай, на ўсе чатыры бакі!

КАПА. У нас жа пакой свабодны, можа у нас пераначаваць!

МАМА. Капа, ты пра што?

КАПА. Пакой у нас свабодны: я – у адным, Юра – у другім, а трэці пустуе.

МАМА. Госць у нас праездам, хутка на вакзал. *(Ходзіць.)* Шэсць! Капа, сямёркі беражы, спатрэбяцца!

ЯНА. Мама, можа хопіць гуляць!

КАПА. У мяне таксама дзве шасцёркі!

МАМА. Капа, давай, давай, падкідвай фокусніку!

КАПА. Вам дзякуй, што грошы майму даяце! І дзевятку вам! Яму лепш даць, ён жа верне, рукі залатыя, хоць і на пенсіі. П'е толькі!

МАМА. Узяў фокуснік. Кара, хадзі!

КАПА. Дзесяць яшчэ дзесяць! Але заўжды вернем! А калі не даць, не супакоіцца! Туз! Ён добры! Пакуль вы думаеце! Але хворы!Столькі гадоў пражылі разам, ногі баляць, і рабёначак нежывы. Я хаджу. Туз зноў! Меншых няма! Ён прыйшоў, і пра рабёначка, што я вінаватая. Ногі хворыя, а рукі... няхай п'е. Можна яшчэ туз? Вось і добрачка! Вы ходзіце? Я яго ўчора рукамі так ударыла, так ударыла. Думала ўсё: скроні ў крыві, вады яму, нічога, ачуняў. А я так плакала, так плакала. Я яго рукамі – аб шафу!

МАМА. Бярэцё?

ЁН. Бяру.

МАМА. Капа, хадзі!

КАПА. Зноў я? Нешта тут не так!

ЯНА. Якая розніца? Хадзіце!

МАМА. Мы дурнямі больш не будзем!

КАПА. Але ж, неяк, зноў я?

ЁН *(да Мамы).* Вам вельмі хочацца выйграць?

МАМА. Так, хочацца, хоць аднойчы.

ЁН. У карты?

МАМА. Так, хоць аднойчы, хоць у карты.

ЁН. Навошта?

МАМА. Ненавіджу! Дзе твой поезд, фокуснік? Чаму ён не прыходзіць?

ЁН. Я застаюся.

КАПА. І дзед мой застаўся. Усе разбегліся, а ён застаўся. Куды бегчы? Дзевяць сыноў, чацвёра ўжо свае хаты паставілі. А яны кажуць: хутар, нада ў калгас ісці, і дзед – матам. Яны банда, кажуць, адразу не забілі, забілі потым, пуп выразалі – і цвіком да дуба прыбілі. І дзеда бізунамі вакол дуба ганяць! Пакуль кішкі не выматаў, песні пеў і равеў: «Тут мая зямля, тут!» Там і застаўся пад дубам ляжыць. А дайсці не магу: ногі хворыя. А машыны ў нас няма.

МАМА. Дваццаць восем машын твой прапіў, у глотку загнаў. Піць бы кінуў – метро б да дуба правялі...

КАПА. Ён не кіне, ніколі.

ЯНА. Я не хачу больш гуляць.

МАМА. Апошні раз, рашаючы!

ЯНА. Ты выйграла. Я здаюся!

ЁН. Я не здаюся!

ЯНА. Навошта?

ЁН. Не хачу здавацца! *(Да Мамы.)*Пагуляем!

МАМА. Капа, ты глянь, паглядзі на яго, хто ён такі?

КАПА. Госць, праездам.

МАМА. Капа, гэта не госць, гэта бес, жыццё зламаў і ёй, і мне. У мяне пазванкі жыцця не сходзяцца, нагамі зламаў.

ЁН. Якія пазванкі, што я зламаў?

МАМА. Маўчы, нахабнік! Нават фокусы не помніш!

ЯНА. Мама!..

МАМА. Мама. Нарадзіла цябе, толькі навошта? Калі б усё дзярмо, што я з-пад хворых вынесла ў адно месца зліць, мора было б, акіян, Байкал. Дзеля чаго? Дзеля каго?

КАПА. Што вы! Што вы! Яна ў вас харошая!

МАМА. Харошая? *(Да Яе.)* Ты ўчора на базары шлёпанцы купіла, і што? Адзін трыццаць дзевяты памер, а другі – сорак першы. Ты памяняла? Ты схадзіла, харошая? Вось цяпер і будзеш хадзіць паміж сорак першым і трыццаць дзевятым.
ЁН *(раптам).* Давайце вып'ем!
МАМА. А ты, госць, яшчэ тут?

ЁН. Я – насупраць!

МАМА. Рукой памашы!

ЁН *(маша рукой).* Вось ён я!

МАМА. Точна, бачу руку, варушыцца! Фокус успомніў?

ЯНА. Мама, а можа ўсё ж такі да Веры? Да сяброўкі?

МАМА. Усё сказала?

ЯНА. Усё.

МАМА. Нікуды я не пайду. «Сяброўка», я – бегчы, а яна сяброўка мая лепшая, сэрца, кажа, дрэнна, дрэнна мне, гэта, каб я дадому не ішла, а ад самой цыгарэтай нясе. Сэрца! А ў мяне яго няма? Пуста тут? Тут пуста? Дачушка мая, ты ў ёй дамовілася, каб мяне затрымаць, каб вось тут, вось з гэтым вось. Канспіратар, не возьмуць цябе ў ЦРУ!

ЁН. Я не ведаю, што мне рабіць.

МАМА. І па тэлевізары таксама гавораць менавіта так.

ЁН. Вы мне даруйце.

МАМА. Бог даруе, я – не.

ЁН. Але я не разумею.

ЯНА. Хочаш, я табе растлумачу?

ЁН. Хачу.

ЯНА. Ты настолькі добры, што з лішкам. Разумееш, ёсць «ліха», а калі маленькая – «лішка». Дык вось тваё дабро з «лішкам». Я не аб працы. Там ты па-сапраўднаму добры, бо справядлівы. Я ведаю. Я ўсё пра цябе ведаю. А вось у жыцці табе ўсіх шкада. І не любіш чалавека, поскудзь ён: ну як жа пакрыўдзіць, нельга, чалавек жа, шкада. А ў выніку, поскудзь думае, што яна – добры чалавек, таму што побач ты быў, добранькі. Гаркаватае тваё дабро, і чаромха тая была горкай.

ЁН. Якая чаромха?

ЯНА Восьмы клас. Ты паехаў з сябрамі на лодцы па чаромху. Ён быў закаханы, а сяброўкай яго каханкі была я. Ён сказаў табе: «Памажы, без сяброўкі яна не паедзе. Вось ты ёй і займіся, ты ж сябар». І ты, добры сябар, паехаў. Не хацелася табе быць са мной, але трэба ж зрабіць сябру дабро. Ты ж добры. Гэта я толькі зараз разумею, а тады...

ЁН. Пялёсткі сапраўды былі горкімі.

ЯНА. Ты ламаў галіны, яны падалі, падалі снегам, завеяй. Ёсць што ўспомніць.

ЁН. Я нешта гаварыў?

ЯНА. Ты многа гаварыў, прабач.

ЁН. Ты мяне прабач.

ЯНА. За што? Ты ж жывы.

КАПА. Ой, як жа добра!

МАМА. Што добра, Капа? Што добра? Яна ж пасля дзясятага класа ў пятлю лезла. З'едзем з гораду, і ўсё! А горад жа зялёны, ціхі. Я зразумець не магла: куды паедзем, куды пераедзем. Добра, галоўнага ўрача сюды перавялі, ён дапамог.

ЁН. Ды я ж з арміі да Юркі пісаў, пра цябе пытаўся. Не ведаў ніхто. Цябе ўжо не было.

ГОЛОС. Калі ласка, давайце не будзем крычаць! Калі ласка!

*Усе здранцвелі, а Федзя… Трошкі пра Фёдара Фёдаравіча: ён – дамавік. Кожны з нас уяўляе іх па-рознаму, але гэты, паверце мне, калі ласка, апрануты ў пацёртую фрачную пару, якая вельмі лоўка на ім сядзіць, бабачка пры ім і канацье. Наогул, вельмі такі благапрыстойны дзядок гадоў гэтак…(Бадай, дамавікі і ўзрост. Вось толькі шчакаў яго перавязаная, можа, зубы і ў іх баляць.) Усе здранцвелі.*

ФЕДЗЯ. Калі ласка, час позні. Ну, навошта крычаць?

КАПА. А я і не ведала, што ў вас так многа гасцей.

МАМА. Якія госці? Ты хто?

ФЕДЗЯ. Анёл-ахоўнік.

МАМА *(Яму).* Ты што сядзіш? Бомж у кватэры, выкінь яго! У міліцыю пазвані. Ты ж сам – Міліцыя!

ФЕДЗЯ. Тэлефон не працуе.

ЁН. Праверце хто-небудзь. Грамадзянін, я сапраўды з міліцыі, вось пасведчанне.

ФЕДЗЯ. Дазвольце зірнуць.

ЁН. Калі ласка.

МАМА *(пра тэлефон).* Не працуе.

*А пасведчанне ў руках Федзі ператварылася ў вялізны букет кветак.*

КАПА. Ой!

ЁН. Вы што сабе…

ФЕДЗЯ. Дазваляю, дарагі мой, часам дазваляю.

МАМА. Яшчэ адзін фокуснік.

ФЕДЗЯ. Прабачце, што кветкі не сапраўдныя, але час позні, а на вуліцы зіма.

ЁН. А пасведчанне?

ФЕДЗЯ. У левай унутранай.

ЁН *(дастаючы пасведчанне з унутранай кішэні).* Дзякуй, але ўсё ж такі...

ФЕДЗЯ. Хто я? Гэта самае складанае пытанне з усіх, якія мне за гэтыя стагоддзі задавалі.

МАМА *(да Федзі, гучна).* Што з тэлефонам?

ЯНА. Мама! *(Да Федзі.)* Калі гэта розыгрыш... то, гэта ж вы самі сказалі... час позні...

ФЕДЗЯ. Гэта не розыгрыш, я ўсё растлумачу. *(Да Мамы.)* Перад тым, як пайсці ад сяброўкі, вы званілі па тэлефоне?

МАМА. Ну так, ад Валі, па справе.

ФЕДЗЯ. Вось і я, прынамсі, прыйшоў папярэдзіць па справе. Вас усіх сёння паспрабуюць абрабаваць.

ЁН. Вы гэта сур'ёзна?

ФЕДЗЯ. Інакш мяне б тут проста не было.

ЁН (*да ўсіх*). А я чамусьці яму веру.

МАМА. А ты тут пры чым?

ФЕДЗЯ. Пры тым, што ён не рабаўнік.

МАМА. Так?!

ФЕДЗЯ (*да Яго*).Перадайце кветкі даме.

ЯНА (*беручы кветкі*). Дзякуй.

КАПА. Паслухайце, вочы ў яго зусім не бамжыныя.

МАМА. А ты адкуль ведаеш?

КАПА. Мама казку расказвала пра лебедзяў і хлопчыка. у яго вочы – лебядзіныя.

МАМА. Якія, якія?

ЯНА. Мама!

МАМА. Я тысячу гадоў мама. *(Да Федзі.)* Хто ты такі?

ФЕДЗЯ. Жанчына, давайце разбярэмся.

МАМА. Адрамантуй тэлефон.

ФЕДЗЯ. Ён працуе, праверце.

МАМА *(пераканаўшыся).*Працуе. *(Да ўсіх.)* Я званю.

ЯНА. Калі ласка, мама.

КАПА (*сама сабе*). Такія ж вочы, ну, такія ж.

МАМА. Добра. *(Да Федзі).* Дакументы папрашу.

ФЕДЗЯ. Жанчына, ну прабачце, якія ў дамавіка дакументы. Я проста жыву тут, з вамі.

МАМА. З намі?

ФЕДЗЯ *(да ўсіх).* Паважанае спадарства, выслухайце мяне, калі ласка. М-м-м!

КАПА. Зуб?

ФЕДЗЯ. З учарашняга дня.

КАПА. Календулай добра.

МАМА. Капа, якая календула?

ФЕДЗЯ. Вы мульцікі глядзіцё?

КАПА. Я гляджу.

ЯНА. І я, часам.

ЁН. І я.

МАМА. Мне некалі.

ФЕДЗЯ. Пра Нафаню помніце мульцік, Віцын агучвае. "Нафаня, Нафаня?" Ну?

КАПА. Я бачыла.

МАМА. І што?

ФЕДЗЯ. Уявіце сабе, што Нафаня – гэта я, але імя маё – Федзя.

МАМА. Вар'яцкі дом!

ФЕДЗЯ. А я ў гэтым доме дамавік, ну, дамавы! *(Званок у дзверы.)* Не адчыняйце, гэта яшчэ не рабаўнік.

МАМА. Я званю ў міліцыю.

ЁН. Міліцыя тут, пачакайце!

*Патрабавальны званок у дзверы.*

ФЕДЗЯ. Усё будзе ў парадку.

ЯНА. Вы думаеце?

ФЕДЗЯ. А чым мне яшчэ займацца? *(Ціхі званок у дзверы.)* Зараз пойдуць. Нумарам кватэры памыліліся.

МАМА. Капа, ты дзверы за сабой зачыняла?

КАПА. Я не помню.

ЁН. Я схаджу пагляджу. *(Выходзіць у вітальню, адчыняе дзверы.)* Тут нікога няма. Дзверы зачыніць?

МАМА. Так. І на ключ, на два абароты. *(Ён вяртаецца ў пакой.)* Усё, я зараз памру.

ФЕДЗЯ. Вам пакуль рана.

ЯНА. А мне?

ФЕДЗЯ. Усім рана.

ЯНА. Вы ўсё-усё пра нас ведаеце?

ФЕДЗЯ. Што дазволена – усё.

МАМА. Дачка, ён што, за намі падглядвае?

ФЕДЗЯ. Вы мне, мама, канешне, прабачце, але вы, шчыра кажучы, нечага не дадумваеце.

КАПА. Вочы тыя ж.

МАМА *(Ёй)*. Ты яму верыш?

ЯНА. Здаецца так.

МАМА *(Яму)*. А ты, капітан?

ЁН. Я ўжо не капітан.

МАМА. Няважна. Верыш?

ЁН. Верую.

МАМА. Капа, а ты маўчы, лебедзь мая. З табой усё ясна. *(Да Федзі.)* Вось тут і зараз, пры мне, цуд ствары, ствары цуд.

ЯНА. Мама!

МАМА. А няхай створыць, а мы паглядзім на гэты полтэргейст.

ФЕДЗЯ. Добра, добра, калі ласка! Толькі зразумейце, што ўсе цуды...

*Яго перабівае пранізлівы званок у дзвер*ы.

Мама, адчыніце дзверы, цуд прыйшоў. Але папярэджваю: хутка з'явіцца і грабежнік.

МАМА. Я пайду, і адчыню. Капітан, стань бліжэй, нас многа.

ЯНА *(да Федзі).* А вы дакладна ведаеце, што гэта прыйшоў не рабаўнік, ніколі не памыляецеся?

ФЕДЗЯ. Часам, на жаль, бывае, але вельмі рэдка.

*У пакой уваходзіць мама, цягнучы за сабой Юру, у таго ў руках бутэлька таннага віна.*

МАМА. Капа, твой цуд прыйшоў. Так, Нафаня, зараз я буду цуды тварыць. Колькі часу?

ФЕДЗЯ. Тэлефон зноў не працуе.

ЮРА. Людзі! У мяне радзіма ў вёсцы. Там, заўжды зямля вялізная і могілкі ў лесе, і мама там ляжыць, там... А іду на радзіму, тры вось такіх (*паказвае на бутэльку*) з сабой. Два прывалы глытаю па адной, апошнюю – калі возера ўбачу і дом... лазню не дабудаваў, гніе. Дап'ю і ўсё. Ачнуся! Падымуць ці сам дайду. А ўжо вяртацца трэба на аўтобус, дамоў. А дзе мой дом?

КАПА. А, Юра, мой залаты, а тут твой дом, са мной твой дом, са мной. Ой, суседзі, ой, людзі, нешта здарылася, здарылася нешта.

ЮРА. Капа, вось гэта купіў, а выпіць не магу. Бесказырку зняў, а далей не магу. Капа, што рабіць? Ратуй!

КАПА. Цуд! Цуд!

ЮРА *(да ўсіх).* Родненькія, а калі разам, сядзем вось так па-суседску, пад тост. А раптам пойдзе?

МАМА. Я такое не п'ю.

ФЕДЗЯ. А вы проста прысядзьце. Чалавек жа просіць.

*Усе сядаюць да стала. Юру наліваюць чарку віна.*

ЁН. Можа, яму "Тамянкі"?

ЮРА. Не. Я сваё. Яно звычнейшае, павінна пайсці. Капа, памаліся за мяне.

КАПА. Я ўжо даўно. Я даўно.

ЮРА *(адставіў чарку).* Не шклянку, шклянку трэба. Гэта – не тое. Трэба, як заўжды.

ЯНА. Фужэр падыйдзе?

ЮРА. Нармальна. Не, шкло не тое. Трэба, каб дно было бачна..

КАПА. Дайце яму звычайную шклянку. Ну, калі ёсць – дайце.

МАМА. Ды прынясу я зараз, прынясу, муку я ёй насыпаю.

*Мама выходзіць па шклянку, Юра настройваецца тым часам на акт выпівання.*

МАМА *(уваходзячы).* Трымайце! Во дзянёк!

ЮРА. За дом ваш, за вас. Каб усё было, і ва ўсіх! За нас з вамі! *(Спрабуе выпіць.)* Не, не ідзе, ну, не ідзе, сабака!

КАПА. А ты за радзіму выпі!

ЮРА *(зноў узяўшы шклянку).* За цябе, Ліна, і за радзіму! *(Спрабуе выпіць.)* Не ідзе! *(Ціха заплакаў.)*

ЯНА *(ціха, да Федзі).* Цуд?

ФЕДЗЯ *(ціха, Ёй.)* Які там цуд? Ці вось тое, што ў шклянцы наліта, чалавек можа піць?

МАМА (*да Федзі*). А вы самі выпіваеце?

ФЕДЗЯ. Ніколі на працы не п’ю.

МАМА. А пасля працы?

ФЕДЗЯ. Шкадую, але заўсёды працую.

ЯНА (*да Федзі*). Жартуеце?

ФЕДЗЯ. Жартую.

ЁН. Дакрануцца да вас можна?

ФЕДЗЯ. Можна нават паціснуць руку.

ЮРА (*паціскаючы Федзю руку*). Юра.

ФЕДЗЯ. Федзя.

ЮРА. Адкуль будзеш?

ФЕДЗЯ. Адусюль.

ЮРА. Усё, маці, здаецца, свае адпіў, час закусваць.

ЯНА. А галубцы згарэлі.

КАПА (*да Юры*). А хочаш, калі я табе зараз клёцкі прыгатую, з душамі?

ЮРА. Ты прабач мяне, Капіталіна Сяргееўна, за ўсё прабач. Алё клёцак я хачу, тваіх, з душамі.

КАПА. Людцы, цуд! Я пабегла!

ФЕДЗЯ. Не трэба бегчы. Клёцкі – на пліце, разагрэць толькі.

ЁН (*да Федзі*). Вы не сон?

ФЕДЗЯ. А вы?

ЁН (*падумаўшы*). Прабачце.

ЮРА (*да Федзі*). Мужык, дзе я цябе мог бачыць? Можа, ля піўной, на Горкага?

ФЕДЗЯ. Не, у люстэрку, напэўна.

ЮРА. Што, кажаце, на пліце? Я сам разагрэю.

*Юра выбягае ў кухню.*

КАПА. Золата мае!

МАМА (*да Федзі*). Вы што, на дзве кватэры працуеце?

ФЕДЗЯ. Я ў кожнага – свой.

ЯНА. Адзіны?

ФЕДЗЯ. А вось гэта залежыць толькі ад нас.

МАМА. Колькі часу?

ЁН. У вас гадзіннік на руцэ.

МАМА. А раптам ён спяшаецца?

ЯНА (*раптам*). Вы мне прабачце, але я прашу тайм-аўт. Выйдзіце ўсе, калі ласка, на хвілінку. Можна я пабуду адна?

МАМА. Дачушка!

ФЕДЗЯ. Мама.

ЁН. Я ў калідоры пакуру.

*Выходзяць усе, апроч Яе і Капы.*

КАПА. У мяне – ногі.

ЯНА. Вось і сядзіце, толькі не здзіўляйцеся. Хаця, давайце разам патанцуем. Гэта проста.

*Заводзіць пласцінку. Гучыць танец кахання.*

КАПА. Дачушка, дзевачка, ты танцуй, танцуй, я раней – таксама. Я пасплю, вось тут.

ЯНА. Гэта проста, я пакажу. (*Танцуючы.*) Лінія белай рукі… маёй… абняць ёю няма каго… Няпраўда – адказвае правая рука… Паглядзі, дакраніся… Гэта туман над возерам… Кропелькі расы на траве… На вуснах тваіх… І плыве бруд… Трубы іржавыя, слізкія… Рукам не ўчапіцца… Не зламаць… Трэба плыць… Але – смурод… Ну і што? Мы ж плывем… Капа, вы спіце?

КАПА (*з заплюшчанымі вачыма*). Не, я таксама танцую.

ЯНА. Гэта мой любімыя танец.

На сайгакаў

Паляваць цяжка,

Іх нельга гнаць,

Мяса будзе смярдзець,

У загоне іх трэба страляць,

У спакоі іх трэба страляць,

На свабодзе іх трэба страляць.

Дроб прадаюць на грамы,

Жаканы – на кілаграмы,

У цішыні сайгака забіць,

Сажраць яго – жыць!

Салодкае мяса, каўбаса,

З якога мы ўсе – мя-ая-а-я-са!

Вось такі танец. Гэта – “Фламенка”. (Да Капы.) Танцуем! Давайце патанцуем!

КАПА. Але я вельмі павольна танцую і даўно.

*Танцуюць.*

КАПА (*танцуе і спявае*). Трубы іржавыя… Абняць няма каго… Нехта скача… Паўсюль туман… А ў руках у кожнага – кілаграм… Не смярдзіць, але плыве… Нехта нас знойдзе-е-е! Я правільна танцую?

ЯНА. Геніальна танцуеце. А ў Бога вы верыце?

КАПА (*працягваючы спяваць*). А хто верыць, той знойдзе-е-е! (*Спыніўшыся.*) Ой, што гэта я раблю?

ЯНА Вы танцуеце! Мы танцуем! І давайце далей!

КАПА. А дзе ўсе?

ЯНА. Правільна! Запрашаем усіх! Гэй, танцуюць усе!

*Яна бяжыць у кухню, у калідор, усіх прымушаючы танцаваць.*

КАПА. Ой, добра, ой, добранька А я пасяджу.

ЁН (*да Яе*). А вас запрасіць можна?

ЯНА. А чаму б і не.

ЮРА (*уваходзячы*). Пяць хвілін – і клёцкі гатовыя.

ФЕДЗЯ (*узнікаючы*). Жонку запрасі, а я – Маму.

ЮРА. Ёсць! (*Запрашае Капу*).

КАПА. Ты са мной? А ногі мае?

ЮРА. Ногі ў цябе – твае… (*Танцуюць.*)

КАПА. Цуд! Цуд! Цуд!

ФЕДЗЯ (*да Мамы*). Вы дазволіце?

МАМА (*глянуўшы на столь*). Так.

ЁН (*Ёй, танцуючы*). Разумееш?

ЯНА. Разумееш.

ЁН. Разумееш, я аднойчы: гэта быў Новы год, пяты клас ці шосты, не памятаю, мы круціліся вакол ёлкі, я не круціўся, я глядзеў на цябе, ты была прынцэса, я так баяўся, што цябе ўкрадзе Снежная каралева. Ты танцавала з прынцам. Танцы з прынцам у пятым класе.

ЯНА. І што?

ЁН. А потым прынц наступіў табе на нагу. І ў цябе з’явіліся зубы.

ЯНА. У мяне?

ЁН. Так, так, на тваім твары з’явіліся зубы. Ты хацела быць прыгожай, а ён табе ўсё сапсаваў. Ты магла б яго ўкусіць, і я спалохаўся.

ЯНА. Мяне?

ЁН. Сябе. Я, пірат, спалохаўся, што аднойчы я, марскі драпежнік, наступлю табе на нагу.

ЯНА. А я не памятую.

ЁН. А баль памятаеш?

ЯНА. Не. Я памятаю толькі потым ты падарыў мне слуп.

ЁН. Срабны. Яго ўжо няма. Замянілі на бятонны. Але дрэва побач стаіць.

ЯНА. Бяроза. Ты падараваў мне яго проста так?

ЁН. Не ведаю. Не разумею зараз і тады не разумеў.

ЯНА. Але ж ты старэйшы!

ЁН. У той час старэйшай была ты. Любая таямніца заўжды старэйшая. Усё было складана.

ЯНА. Зараз прасцей?

ЁН. Чаму ўсё так няскладна? І я, як жалезабятонны слуп… (*Толькі зараз яны заўважылі, што ніхто даўно ўжо не танцуе, ды і музыка не гучыць.*)

ЯНА. Чаму ніхто не танцуе?

МАМА. Мы таксама танцуем… слупамі.

ЕДЗЯ. Гэта і ёсць Фламенка.

ЁН. Прабачце.

ФЕДЗЯ. Так есці хочацца.

ЮРА. Чакайце! Момант! Такія клёцкі! Так, усе за стол!

*Выбягае ў кухню.*

ФЕДЗЯ *(да Мамы*). Дазвольце запрасіць вас за стол.

МАМА. А вы што, таксама есці будзеце?

ФЕДЗЯ. А ўвас тваражок ёсць?

МАМА. Ёсць.

ФЕДЗЯ. Наш?

МАМА. Ну, не магазінны ж!

ФЕДЗЯ. Падыдзе! Разынкі?

МАМА. Таксама купіла.

ФЕДЗЯ. Паў чайнай лыжкі тваражку і разыначку зверху, калі ласка, і пакладзіце на край стала. І выключыце святло.

МАМА. Вось так зараз?

ФЕДЗЯ. Калі можна.

МАМА. Я пайшла. (*Выходзіць.*)

ЯНА (*да Федзі*). Раскажыце пра сябе.

ФЕДЗЯ. Ой, гэта нудна!

ЯНА. Вам бывае нудна?

ФЕДЗЯ. І праўда, бывае сумна, а нудна – не! Пра сябе – што? Я ж пра сябе ўсё ведаю, а вось сумна бывае з вамі… часам. І пашабуршыш, і пастукаеш, і ў сон прыйдзеш, а там – суцэльныя венікі.

ЯНА. Венікі?

ФЕДЗЯ. Я чалавеку аднаму служыў.

ЯНА Служылі?

ФЕДЗЯ. Ці ў доме ягоным жыў, як хочаце. Ён з лета ў лета, праз дзень па венікі ў лес ездзіў. У сне ў яго пытаюся: “Навошта табе іх так многа?” А ён кажа: “Калі яны зараз такія дарагія, дык што я потым рабіць буду?” Гэта зразумела. Гэта па-вашаму, а ў яго ж на дачы ўсё гарышча старымі венікамі набітае. Я не разумею, у мяне баншчык, калега,

служыць. Калі б не ягонае гарышча, ён бы яму кожны раз свежанькі ў руку клаў… Я ад яго і сышоў. Так што, сумна, гэта, калі толькі венікі.

ЯНА. А ў нас? У мае сны вы прыходзіце?

ФЕДЗЯ. А ў вас гэта, як зараз. Сноў вашых я баюся. Мне там дыхаць няма чым. Суцэльная чаромха!

КАПА (*пра свае*). Не выпівае і танцуе… са мной… Фламенка… Цуд!

ФЕДЗЯ. Цудаў няма! Проста яму ўжо час – не піць і танцаваць!

КАПА. Вы не пра нуднае?

ФЕДЗЯ. Не, што вы? Я – пра вечнае!

ЁН (*да Яе*). Я не магу растлумачыць, але пастараюся. Тады – зубы твае з аднаго боку, а з другога – чаромха.

ЯНА. Паглядзі на мае зубы зараз. Вось яны! Адна пломба. Вось тут, злева, бачыш. Яны што, злыя?

ЁН. Прабач, у цябе вельмі прыгожыя зубы.

ЯНА. І што?

ЁН. Я не магу растлумачыць, я не ведаю, як гэта зрабіць.

ФЕДЗЯ. Прабачце, але менавіта зараз дом будуць рабаваць.

*Званок у дзверы.*

МАМА (*уваходзячы, да Федзі*). Я ўсё зрабіла. Тваражок на краёчку, дзве разынкі, выключальнік – злева.

ФЕДЗЯ. Нас зараз будуць рабаваць!

МАМА. Нас?

ФЕДЗЯ. Цішэй.

МАМА. За што?

ФЕДЗЯ. Цішэй! Яны не выбіраюць, выбіраючы!

ЯНА. Вы не памыляецеся?

ФЕДЗЯ. Былі падставы мне не верыць?

ЯНА. Не.

ФЕДЗЯ. Сякера ёсць?

МАМА. Адкуль?

ФЕДЗЯ. А маленькая?

МАМА. Для мяса? Ёсць!

ФЕДЗЯ. Падыдзе. Давайце!

*Званок у дзверы.*

ЁН. Вы гэта ўсур'ёз?

ФЕДЗЯ. Я жартую, а яны звоняць.

*Званок у дзверы.*

КАПА. У суседнім пад'ездзе дзядульку прыдушылі, адзін дома быў.

ЁН. Дык што ж рабіць?

ФЕДЗЯ. Вы ж мужчына! Дом трэба бараніць!

КАПА. А да вас навошта?

*Уваходзіць Юра з каструляй у руках. Яна гарачая.*

ЮРА. Гатовыя! Каму з юшкай?

ФЕДЗЯ. Юра, я адчыняю, а вы з каструлі – проста ў твар.

ЮРА. Навошта?

ФЕДЗЯ. Самаабарона клёцкамі.

МАМА. Нас рабуюць!

ФЕДЗЯ. Ціха!

ЯНА. А вы не памыляецеся?

ФЕДЗЯ. Не верыце? Адчыніце! Адчыніце дзверы!

ЯНА. Я адчыню.

ЁН. Прабач, адчыню я.

*Ён падыходзіць да дзвярэй, пачынае адчыняць іх.*

*Фінал першай дзеі.*

*Ой! Ледзь не забыў: менавіта ў гэты момант з-за вакна ўсю кватэру пачаў залiваць багровы, трывожны колер, а ўжо потым – заслона.*

## ***ДЗЕЯ ДРУГАЯ.***

*Кватэра ў багровым святле. Ён стаіць каля дзвярэй.*

ФЕДЗЯ. Вы, як ведаеце, а я здымаю з сябе адказнасць. (*Да мамы.*) Выключальнік злева?

МАМА. Злева. Дзе? Ах, так!

ЁН (*адчыніўшы дзверы, да ўсіх*). Там нейкі чалавечак Федзю пытаецца.

ФЕДЗЯ. Мяне, ці што?

ЁН. Ну, іншых Фёдараў у нас, быццам бы…

ФЕДЗЯ. Камізэлька з футра?

ЁН. Так.

ФЕДЗЯ. Шапка зімовая, ірваная?

ВАСЯ (*уваходзячы*). Нармальная шапка. Добры дзень, людзі добрыя.

ФЕДЗЯ. Та-а-а-к! З’яўленне цябе народу!

МАМА. Гэта хто? Федзя, я ў вас пытаюся.

ЯНА. А дзе рабаўнік?

ФЕДЗЯ. Будзе вам рабаўнік, будзе. (*Да Васі.*) А ты, памылка мая, сам прыйшоў, сам і растлумач усе.

ЯНА (*да Васі*). Сядайце, калі ласка.

*І чамусьці ўсе садзяцца да стала.*

ЮРА (*да мамы*). Мне б падставачку пад клёцкі, сурвэткі шкада.

МАМА (*выходзячы ў кухню*). Я зараз.

ФЕДЗЯ (*услед*). І тваражок мой захапіце, калі ласка.

ВАСЯ. Пахне смачна. А што ў каструльцы?

ЮРА. Клёцкі з душамі.

ВАСЯ. Гэта добра.

МАМА (*заходзячы*). Вось вам падставачка, вось вам тваражок з разыначкай. (*Да Васі.*) А вам што?

ВАСЯ. Душачку б мне, маленечкую.

МАМА. Якую такую душачку?

ЯНА. Вось талерка, пакладзі яму клёцку.

ВАСЯ. Мне маленечкую-маленечкую.

МАМА (*падаючы клёцку Васю*). Прашу.

*Сядзяць Федзя і Вася перад талеркамі, прынюхваюцца, пераглядаюцца, але маўчаць, і ніхто есці не пачынае.*

МАМА. Можа, і святло вам выключыць?

ФЕДЗЯ. Калі не цяжка. Хто гэта бачыў, каб мы, дамавікі, пры святле прыборамі грукалі.

ЁН. Прабачце, калі ласка, усё ж такі, вы нас не разыгрываеце?

ФЕДЗЯ. Давайце я вас ушчыкну.

ЁН. Давайце (*І Федзя як ушчыкне.*) Гэта на самой справе балюча.

ФЕДЗЯ. Ну, які тут розыгрыш!

ЯНА (*да Федзі*). Можна я свечку запалю, каб не зусім у цемры сядзець?

ФЕДЗЯ. Калі ласка. Толькі пастаўце яе туды, бліжэй да сябе.

КАПА. Ой!

МАМА. Што, Капа?

КАПА. І я сябе ўшчыкнула. Балюча!

ЯНА. Мама, выключы святло.

МАМА. Усё для вас. Калі ласка!

*Святло гасне. Федзя і Вася са смакам пачынаюць есці.*

ВАСЯ. І калі можна, ножычак.

МАМА. Гэта яшчэ навошта. Клёцкі на відэлец натыкаюць.

ФЕДЗЯ (*да Васі*). Ты што, сюды клёцкі есці прыйшоў? Расказвай!

ВАСЯ. Хвіліначку. Кавалачак апошненькі. Ой, і смачна ж было! Дай Бог таму здароўя, хто іх гатаваў.

ФЕДЗЯ. Не падлізвайся. Навошта прыйшоў?

ВАСЯ. Можна святло ўжо ўключаць.

*Мама ўключае святло*.

ФЕДЗЯ (*да Васі*). Цябе і так бачна. (*Да ўсіх.*) Мы з Васем – калегі.

ВАСЯ. Хто калега, а хто і калека.

ФЕДЗЯ. Перастань.

ВАСЯ. У мяне ножка адна карацейшая за другую. А што, іду і прытанцоўваю.

ФЕДЗЯ. Ну, і навошта ты вальсіраваў?

ВАСЯ. Федзя, мы ж з табой сябры. Не прыспешвай!

ЯНА. Фёдар, а як па бацьку?

ФЕДЗЯ. Фёдаравіч.

ЯНА. Фёдар Фёдаравіч, не прыспешвайце яго, калі ласка.

ВАСЯ. Вось. Чуў? А ты!

МАМА. А вы хто?

ВАСЯ. Па-вашаму – Вася. А наогул я – Веспассіліян.

ФЕДЗЯ. Я маўчу.

ВАСЯ. Паўгода таму дзед памёр.

ЮРА. А што дзед? Дзе жыве? Можа, ведаю.

КАПА. Цішэй, Юра.

ВАСЯ. Так, трэба спачатку.

ФЕДЗЯ. Ну, з самага пачатку не трэба, прашу.

ВАСЯ. Я з дзедам сваім ад самай Перамогі жыў. Харошы быў дзед. Павучка не паўкрыўдзіць. Варвару пахаваў, жонка была, таксама харошая.Ката любіў і мяне паважаў. Хлеба на стол пакрышыць і крычыць: “Не хадзі сюды, не еш майго хлеба”. І рагоча. І я рагачу. З пенсіі дзербалызне…

ЮРА. Наш дзед. А я што зараз?

КАПА. Ціха, Юра.

ВАСЯ. І прыпеўкі галасіць! Усе, прабачце, мацерныя. Кот пад печ заб’ецца, а я…

ФЕДЗЯ. А ты? Ну, скажы, скажы людзям!

ВАСЯ. Я, як мог, падпяваў. А што? Ён жа па-добраму лаяўся.

ЁН. Сон, сон, ці казка.

ЯНА. Ну, і няхай.

ВАСЯ. Потым дзеда ў бальніцу адвезлі, я вырашыў чакаць, а куды там чакаць – дзеці за тыдзень хату раскаталі: на лазню нехта купіў. Печ толькі засталася, і мы з катом, і зіма…

ФЕДЗЯ. Вася, я ж не ведаў.

ВАСЯ. А што цябе турбаваць! У цябе ў самога вунь полная кватэра.

МАМА. Можа, яшчэ клёцачку?

ВАСЯ. Дзякуй, я наеўся. Параіліся мы з катом і ў бальніцу. І дзеда адшукалі. А дзед нас ужо і не чуе, і не бачыць. А робіцца што там! Шаснаццаць ложкаў: хто стогне, хто крычыць, хто пукае, прабачце, храпе кожны першы, а дзед так ціха-ціха і пайшоў, ну… туды. Шкада дзеда. Мы з катом у калідор выйшлі і заблукалі… Ад слёз жа не бачыш, куды ідзеш. Я нейкія дзверы адчыніў… ісці ж некуды трэба. А адтуль голас: “Рыжы, ты хто?” Я кажу: “Вася”. – “А з табой хто?” – “Кот, - кажу. – Таксама Вася. Мы заблукалі”. – “Заходзьце, кажа, – Васілі, прыблыкалі ўжо”. І мы – пад ложак. Добра так! Размаўляў з намі, карміў, увесь час пісаў нешта… Урачы аблаяць, а ён тады па начах піша. Пісьменнік… важны… адзін ляжаў.

КАПА. А далей?

ВАСЯ. А потым прыйшоў урач і выпісаў пісьменніка. “Здаровы”, – кажа. Ён рэчы збірае, а мы пад ванну забіліся. Сумна, зноў адны.

МАМА. І што, так і кінуў?

ВАСЯ. Ну, вы скажаце – кінуў. На калені перад ваннай стаў і кажа: “А ну дамоў пайшлі, Васілі!” І мы пайшлі пехам, недалёка было. Па дарозе ён у мяне пытаецца: “А чаму гэта ў цябе вочы такія блакітныя?” А я кажу: “Вясна”.

*Цішыня, толькі свечка патрэсквае.*

МАМА. Вася, і ўсё гэта праўда?

ВАСЯ. Дзедам клянуся.

ФЕДЗЯ. Пашанцавала проста.

ВАСЯ. А табе не пашанцавала? Я ж памятаю, якія ты дыяграмы пра гэтых сваіх спяваў.

ФЕДЗЯ. Дыфірамбы, Вася, дыфірамбы!

МАМА. Пра нас спяваў?

ВАСЯ. Вы б паслухалі!

ФЕДЗЯ. А далей што было?

ВАСЯ. Далей – рай. Кватэрка ў яго маленькая. Адзін пакойчык. Кніжкі на ўсіх сценках, на падлозе, па кутах павучкі, усё, як трэба, а сам…

МАМА. Прабачце, што перабіваю, але наконт павукоў – гэта абавязкова?

ВАСЯ. Ну, як жа? Не зусім, канечне, каб вокны заплялі, чыста павінна быць. Але забіваць нельга – грэх!

ЯНА. Ведаеце, я іх таксама не баюся.

МАМА. У нас што – ёсць павукі?

ЯНА. Два.

МАМА. Дзе?

ЯНА. Не скажу!

КАПА. Вось і я, мяне ж ніхто не вучыў, але ж у кватэры прыбіраюся, павуціну змяту, а гэтыя… чакая, калі разбягуцца. Вось як адчувала.

ВАСЯ. Вось і ён прадчуваш. Ён жа таксама дзетдомаўскі.

КАПА. Ой, як і я.

ВАСЯ. Я ж і кажу. А бываюць людзі, быццам, усё ў іх, а не адчуваюць.

КАПА. І Юра мой таскама адчувае. Таксама. Ён жа ведаеце, што робіць? Ён макаўкі на царквах крые.

ЮРА. Я не крыю, я залачу.

ЁН. Макаўкі на царквах?

ЮРА. Макаўкі. Раней менш працы было. Бога ж забаранялі. А зараз… была б сіла.

МАМА. А я і не ведала.

КАПА. Ён наогул, харошы.

ЮРА. Які я там харошы? Харошы я, калі на макаўцы сяджу. Сядзіш на ёй, а макаўка, як сонца, і ты проста на сонцы сядзіш. А сонца гэтае тваімі рукамі зроблена. І зямля, ну такая зямля, што… Ну, а ўнізе яна нейкая маленькая, ці што, робіцца.

КАПА. А ты не пі, не пі больш, сонейка ты маё. Цябе ж зараз не цягне?

ЮРА. Зразумець не магу. Вунь жа, бачу стаіць, а не хочацца, і тэмпературы няма.

КАПА. Дай сюды лоб.

ЮРА. Ай, што там лоб!

КАПА. Няхай бы ты ўсё жыццё хварэў, толькі б гэтай гары табе не хацелася.

ФЕДЗЯ (*да Васі*). А твой выпіваў?

ВАСЯ. А як жа? Як людзі. На Новы Год, на Вялікдзень. Усё пагражаў пра нас з катом напісаць…

ФЕДЗЯ. Можа, напіша яшчэ?

ВАСЯ (*самотна*). Можа, і напіша…

МАМА. Дык што здарылася?

ВАСЯ. Ён дома, калі пісаў, спяваў. Песні ведаў старадаўнія. Кот “мур-мур” падпяваў, я ў кутку шабуршаў.

ФЕДЗЯ. І што?

ВАСЯ. Закахаўся.

КАПА. Што вы кажаце?

ВАСЯ. Пісаць перастаў, не пісаў, але ўсё на дробныя кавалачкі. Курыць зноў пачаў…

ФЕДЗЯ. Ну, дык гэта ж добра, гэта выдатна проста.

ВАСЯ. Каму добра? Каму выдатна? Яна – усе кніжкі – на палічкі, павукоў – вон, на катоў у яе – алергія, мяне б убачыла – на рыжага была б алергія. Яму патрэбен рабочы кабінет. Ён сябе не цэніць. У яе футра няма, а ў той – ой якая! Кот не вытрымаў першы: “Ну што перашкаджаць?” На гарышча сышоў. Мяне ён не бачыць, нават, калі побач сяду, не

бачыць. А ў бальніцы выратавальнікамі называў. На кухні начамі – сядзіць, а ліст да раніцы – белы і чысты. І маўчыць, не спявае.

МАМА. Прыгожая хоць?

ВАСЯ. Не ведаю. Вось вы зараз прыгожая, сардэчная такая, спакойная.

МАМА. Гэта я спакойная? Ворагам бы маім гэткі спакой!

ФЕДЗЯ. У вас шмат ворагаў?

МАМА. Знойдзем, калі пашукаць.

ЯНА. А як жа кот?

ВАСЯ. Са мной, як жа я яго кіну?

МАМА. Дзе?

ВАСЯ. Вось. (*Развязвае мяшок, а там – кот паласаты.*) Ні ў каго алергіі на катоў няма?

КАПА. А прыгажун! Можна патрымаць?

ВАСЯ (*перадаючы Ёй ката*). Ён любіць, калі за правым вухам чухаюць.

ФЕДЗЯ (*да Васі*). Прывітанне, таварыш!

ВАСЯ. Добры дзень, Федзя.

МАМА. А малако ён любіць?

ВАСЯ. А то.

МАМА (*да ката*). Пайшлі, пакармлю. *(І панесла паласатага ў кухню карміць.)*

ФЕДЗЯ (*да Васі*). Куды зараз?

ВАСЯ. Не ведаю. Пагрэемся і пойдзем, нешта ж будзе! Ведаеш, Федзя, мне заўжды зімой не шанцуе. Разумееш, як толькі зіма – усё, чакай бяды.

*Званок у дзверы.*

ФЕДЗЯ. Ну, вось і рабаўнік!

МАМА (*уваходзячы*). Ну, хто яшчэ?

ФЕДЗЯ. Нарэшце, і рабаўнік ваш.

МАМА. Дык ужо ж позна.

ФЕДЗЯ. Яму ніколі не позна.

ЯНА. А калі зноў памылка?

ФЕДЗЯ. Аб заклад?

*Працяглы званок у дзверы.*

ЮРА. Клёцкі, на жаль, астылі.

ЯНА. На што спрачаемся? А ў закладзе што?

ФЕДЗЯ. На каханне.

ЯНА. Прымаю.

МАМА. Веспассіліян, адчыніце, калі ласка, дзверы.

ВАСЯ. А чаму я?

МАМА. Вам бліжэй.

*Настойлівы званок у дзверы.*

ФЕДЗЯ (*да Яго*). Разбіце!

ЁН (*да Федзі*). Мне здаецца, вы прайгралі.

ФЕДЗЯ. Перахрысціся, калі здаецца, гэта будзе добра.

*Тым часам, Вася адчыніў дзверы і ўвайшоў Рабаўнік.*

РАБАЎНІК. Ой, як нас тут многа!

МАМА. Мае шанаванне!

РАБАЎНІК. Прабачце, што позна. Справы, справачкі! Трошкі і з лішкам, але будзе ьдобра. (*Да Мамы.*) Забярыце гэтыя пакеты, гэта вам. Лізавета Раманаўна, вы гатовыя?

ЯНА. Да чаго я павінна быць гатовая?

РАБАЎНІК. Не зразумеў. Мама, нешта не так? Вы прабачце, я не мог раней. Ды і вы позна пазванілі.

МАМА. Знаёмцеся. Гэта Юра і Капіталіна нашы суседзі.

РАБАЎНІК. Вельмі прыемна.

ЮРА. П’еш.

РАБАЎНІК. Часа дазваляю сабе.

ЮРА. Дрэнна, задумайся.

КАПА. Сонейка наша!

РАБАЎНІК. Растлумачце мне хто-небудзь і што-небудзь.

МАМА. А гэта Фёдар Фёдаравіч і Веспассіліян. Таксама жывуць з намі.

РАБАЎНІК (*не бачачы дамавікоў, да Мамы*). Вы не захварэлі? Навошта крэслы называюць імёнамі?

ВАСЯ. Не бачыць, так яму і трэба.

ФЕДЗЯ. О, калі б нас такія бачылі!

ВАСЯ. І што было б?

ФЕДЗЯ. А нічога б не было. Вася, ён зараз сядзе на цябе! Сцеражыся!

РАБАЎНІК (*да Мамы*). Дазвольце я прысяду.

МАМА. Так-так, калі ласка.

ЯНА. Мама, ты нешта вырашыла, нават не пагаварыўшы са мной?

МАМА. А які сэнс з табой размаўляць? Табе хоць кол на галаве чашы, у каго ты такая?

РАБАЎНІК. Лізавета Раманаўна, дык вы што – не ў курсе?

ЯНА. У курсе чаго я павінна быць?

РАБАЎНІК. Ну, як жа: у вас жа яшчэ дзесяць свабодных дзён. Вось жа білеты на самалёт. Машына ля пад’езда.

ЯНА. Канары?

РАБАЎНІК. Не, Таіці, на Канарах у мяне няма вілы.

ЯНА (*да Мамы*). Дзякуй табе, мама.

МАМА. Ён каву піў – піў. Тры разы. Ты яго выгнала? Ты мне што-небудзь сказала?

ЁН (*да Рабаўніка*). А я вас пазнаў.

РАБАЎНІК. І я цябе. Лізавета Раманаўна, вы, напэўна, не так усё разумееце. Я проста хачу вам дапамагчы. Хачу, каб вы проста адпачылі ад усіх гэтых вашых сачыненняў, праблем, у вашым распараджэнне будзе ўвесь трэці паверх. Я ніякім чынам не намераны.

ЁН. І хто вы зараз?

РАБАЎНІК. Дастаў. Прадстаўляюся хірургам. Прыватная клініка. А на самой справе трыбушу трупы, не сам, канечне, пахавальнае бюро. Звяртайцеся, калі што. Ды і потым, якая розніца Лізавета Раманаўна, я чакая.

ВАСЯ. Фёдаравіч, давай яму якую-небудзь гадасць зробім.

ФЕДЗЯ. Якую?

ВАСЯ. Акуляры схаваем.

ФЕДЗЯ. Ён без акуляраў.

ВАСЯ. Шкада.

ЯНА. Мама, скажы яму, каб ён знік.

РАБАЎНІК. І правільна. Нам няма калі.

МАМА. Ідзіце адсюль.

РАБАЎНІК. Гэта вы мне?

МАМА. Табе, табе, рабаўнік! Фёдар Фёдаравіч, Вася, я – дура.

РАБАЎНІК. Прабачце, мама, вы з крэсламі потым разбярэцеся.

ЁН. Што не зразумела. Вось – дзверы.

РАБАЎНІК. А ты заткніся. Не да цябе!

ЮРА. Можа, усё ж такі, яго клёцкамі…

ВАСЯ. Шкада – астылі.

РАБАЎНІК. Лізавета Раманаўна, вы што не разумееце, што вам нельга заставацца тут? Сярод гэтага хламу? Партрэцікаў гэтых, ірваных калготак. Яшчэ гадоў пяць-шэсць – і усё. Вы сябе загубіце назаўжды. Боршч гэтаму менту варыць? Споднікі яму цырываць? Дванаццаць гадоў мне ўляпіў… Да я гэтыя паўтара гады лепш адпачываў, чым ты на сваёй пракурорскай дачы. А ты на вуліцы хутка будзеш тратуары вылізваць, таму што ты, такі, нам не патрэбен.

ЁН. Усё?

РАБАЎНІК. Я нікуды не пайду. Лізавета Раманаўна. Не пайду, дзеля вас не пайду, дзеля вас!

ФЕДЗЯ (*спачыняючы ЯГО, які рушыў на Рабаўніка*). Не трэба яго біць, мы яго па-свойму, як гэта кажуць, "зробім". (*Крычыць.*) Полтэргейст!

*І хадыром захадзіла кватэра: сцены, мэбля рухаюцца, дзверцы стукаюць, стол казлом скача, люстра лётае, гадзіннік б'е, і ўсё гэта імкнецца ўкусіць, ударыць, ушчыкнуць Рабаўніка, ды і астатняе таксама дапамагае. А вось і дзверы з трэскам зачыніліся за Рабаўнікам з ягоным пакетамі.*

ВАСЯ (*выціраючы спацелы лоб).* Ай, добранька ўпрэў.

ФЕДЗЯ (*прамакаючы пот насоўкай*). Так, папрацавалі трошкі.

*А ў кватэры – бедлам.*

ЯНА. Мама, не плач, усё неяк зладзіцца.

МАМА. Зладзіцца, зладзіцца. Я ж хацела, як лепш. Каб не як у мяне!

ЯНА. А па праўдзе, хто ён быў, бацька? Ну, не безымянны ж разведчык?

МАМА. Цыган ён быў, цыган. Праз мяне і зарэзалі. Тры дні толькі любіла. У яго на макушцы віхор быў, ніяк не ўкладваўся, слінкамі змочвала – і ніяк! І вочы – твае!

ЯМА. Ціха, мама, ціха.

МАМА. І яго зарэжуць "гэтыя". Што будзеш рабіць? Як я, жыць?

ЁН. Мяне не зарэжуць. Спрабавалі ўжо, не атрымалася. І ніколі не атрымаецца. Больш…

ЯНА. І Фёдар Фёдаравіч абяцаў: усё будзе ў парадку.

ФЕДЗЯ. Так яно і будзе.

МАМА (*агледзеўшы развалены пакой*). А хто зараз мэблю на месца… і рамантаваць?..

ЮРА. Зробім, маці. А вось таго мудака я дакладна нідзе не бачыў.

КАПА. Юра.

ЮРА. Прабач, Ліна.

МАМА (*яшчэ ўсхліпваючы*). А чаму Ліна?

КАПА. Капіталіна я. Для ўсіх – Капа, а вось яму – Ліна. Юра, я ведаю, што ты скажаш "так".

ЮРА. Так.

КАПА. Вася, я раблю вам прапанову.

ЮРА. Бачылі, га? Капа, я яшчэ жывы.

КАПА. Жывіце ў нас, калі ласка, з катом, вядома.

ЮРА. І месца навалам, і павукі свае.

КАПА. Зіма ж на вуліцы, халодна.

ЮРА. Дзеда памянём. Чаем, Ліна.

ФЕДЗЯ. Ды згодзен ён.

ВАСЯ (*гледзячы ў падлогу*). Так.

ЮРА. Да пісьменніка сходзім.

КАПА. Ці да нас яго паклічам, у мяне ж ногі.

ЮРА. Да суседзяў, само сабой.

ФЕДЗЯ. Ой, блін, як добра, і ніякіх венікаў!

ЯНА. А далей што?

ЁН. Нам што рабіць? Што далей? “Ах, калі б толькі ведаць, калі б толькі ведаць…”

ЮРА. А давайце клёцак паядзім!

МАМА. Яны прастылі.

ЁН (*падняўшы крышку каструлі*). А чаму пара?

*І сцены кватэры сталі на свае месцы, і рэчы таксама. І авд пары клёцак, і ад агульнага цяпла, нарадзілся музыка. І НАШЫ, шчаслівыя, смачна ядуць клёцкі, чокаюцца чаем, смяюцца. Яны ўсе разам, быццам танцуюць. Так, Фламенка, добры вечны танец кахання. Ой, ледзь не забыўся: і святло за вакном стала такім класным, і нашым таксама. І пайшоў снег.*

*В.М.*